УДК 908:7.071(0.032)(084.1):930.25(476.5)

# Дакументы мастака і краязнаўцы А.І. Мемуса ў фондах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці

**_Карпекін К.Р._**
_Установа "Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці", Віцебск_

_У артыкуле аналізуюцца дакументы мастака і краязнаўцы А.І. Мемуса, якія паступілі ў Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці ў 2021 г. У дадзеным фондзе налічваецца 380 спраў за 1908, 1915, 1926, 1931–1932, 1950, 1953, 1957–2016, 2018–2019 гг., якія асвятляюць жыццё і дзейнасць творчай асобы. У даследаванні пададзены агляд асноўных груп дакументаў: малюнкаў, эскізаў, замалёвак, рэпрадукцый карцін; фотаздымкаў, зробленых А.І. Мемусам; рукапісаў мастацкіх апавяданняў, вершаў, артыкулаў, інтэрв'ю; перапіскі; дакументаў да біяграфіі; дакументаў пра А.І. Мемуса; выяўленчых матэрыялаў; паштовых картак, сабраных мастаком. Пералічаныя дакументы з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для вывучэння выяўленчага мастацтва Беларусі другой паловы XX – пачатку XXI ст., гісторыі беларускай архітэктуры, а таксама грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Віцебшчыны, непасрэдным удзельнікам якога быў А.І. Мемус._

**_Ключавыя словы:_** _асабісты архіў, Віцебшчына, выяўленчае мастацтва, рукапісы, фотадакументы._

_(Искусство и культура. – 2024. – № 3(55). – С. 5–11)_

# Documents of the Artist and Local Historian A.I. Memus in the Funds of the State Archive of Vitebsk Region

**_Karpekin K.R._**
_Institution "State Archive of Vitebsk Region", Vitebsk_

_The article is concerned with the documents of the artist and local historian A.I. Memus, which entered the State Archive of Vitebsk Region in 2021. This fund includes 380 cases for 1908, 1915, 1926, 1931–1932, 1950, 1953, 1957–2016, 2018–2019, which illuminate the life and activities of the creative person. The article provides an overview of the main groups of documents: drawings, sketches, reproductions of paintings, photos taken by A.I. Memus, manuscripts of short stories, poems, articles, interviews, diaries, correspondence, documents for the biography, documents about A.I. Memus, pictorial materials, postcards collected by the artist. The listed documents are valuable sources for the study of Belarusian fine art of the late 20th – early 21st century, the history of Belarusian architecture, as well as the social, political and cultural life of Vitebsk Region, in which A.I. Memus was a direct participant._

**_Key words:_** _personal archive, Vitebsk Region, fine arts, manuscripts, photo documents._

_(Art and Cultur. – 2024. – № 3(55). – P. 5–11)_

_Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: karpekin07@mail.ru – К.Р. Карпекін_

Лёс мастака і краязнаўцы Аляксандра Іосіфавіча Мемуса быў звязаны з многімі рэгіёнамі былога Саюза ССР: нарадзіўся ў в. Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці, затым жыў з бацькамі на Камчатцы, вучыўся ў г. Уладзівастоку, адбываў ваенную службу ў г. Хабараўску, працаваў у г. Белгарадзе і г. Яраслаўлі, потым прадоўжыў вучобу ў г. Ленінградзе. 1 жніўня 1974 г. лёс прывёў А.І. Мемуса ў г. Віцебск: ён быў прызначаны выкладчыкам кафедры малюнка і жывапісу мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава, а пасля свайго звальнення ў верасні 1999 г. мастак застаўся жыць у гэтым абласным цэнтры.

Нядзіўна, што творы мастака знаходзяцца на вялікай адлегласці: яны захоўваюцца ў Мастацкім музеі г. Віцебска, Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі ў г. Мінску, Полацкай карціннай галерэі, Мемарыяльным музеі Уладзіміра Караткевіча ў г. Оршы, Музеі Язэпа Драздовіча ў в. Германавічы, прыватных зборах Беларусі, Расіі, ЗША, Ізраіля, Германіі, Польшчы, Галандыі, Швецыі, Фінляндыі.

Што да скарбаў дакументальных, то ў 2015 г. А.І. Мемус падарыў іх Дзяржаўнаму архіву Віцебскай вобласці, да 2021 г. яны былі апісаны і паступілі на пастаяннае захаванне. Па створаных чалавекам дакументах прасочваюцца асаблівасці яго характару: А.І. Мемус прынёс свае паперы акуратна раскладзенымі па папках і канвертах. Сярод перададзеных матэрыялаў было шмат фотаздымкаў, на адваротах амаль кожнага з якіх творчым почыркам мастака было пазначана, што там адлюстравана і калі быў зроблены здымак. З усіх дакументаў было сфарміравана 380 спраў, і ўвесь іх масіў размеркаваны па некалькіх групах – у залежнасці ад віду і зместу дакументаў.

Першую такую групу складаюць творчыя дакументы, якія характарызуюць А.І. Мемуса як мастака (**арыгіналы малюнкаў, эскізаў, замалёвак, рэпрадукцыі карцін**). Што да абласнога архіва, то сюды патрапіла дастаткова вялікая колькасць партрэтаў, і ў прыватнасці серыя твораў, якую сам мастак назваў “Пялёсткі” (усяго 137 дакументаў). Амаль усе яны выкананы на паперы, але тэхніка – разнастайная: туш, чарнільная паста і пастэль, туш і пастэль, вугаль, аловак, аловак і акварэль, чарніла, фламастар, туш і акварэль, фламастар і акварэль (мал. 1–2). Гэтыя творы А.І. Мемус стварыў на працягу 1976–1996 гг. [3, арк. 7].

Адначасова, працуючы на мастацка-графічным факультэце Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава, А.І. Мемус ствараў партрэты сваіх калег-выкладчыкаў і студэнтаў (і затым 41 такі твор ён здаў на захаванне ў абласны архіў). Як і серыя “Пялёсткі”, згаданыя партрэты датуюцца 1976–1996 гг., (пры гэтым былі выкарыстаны туш, пастэль, аловак, фламастар ці чарнільная паста) (мал. 3). На партрэтах А.І. Мемуса зафіксаваны вобразы выкладчыкаў Я. Важынскага, І. Каладоўскага, А. Кастагрыза, М. Прусакова, А. Чміля і інш. [4, арк. 2]. Адначасова мастак эксперыментаваў з аўтапартрэтамі: у архіў ён перадаў 11 такіх твораў за 1974, 1976, 1979–1981, 1983–1984, 1997–1998 гг. [6, арк. 1]. На групавых партрэтах студэнты мастацка-графічнага факультэта – цалкам у звычайнай абстаноўцы: нехта ў час адпачынку ў перыяд сельскагаспадарчых работ ляжыць на траве, скінуўшы боты, іншыя працуюць над сваімі карцінамі ці сядзяць у задуменні на партыйным сходзе (мал. 4).

Творчы чалавек не мог абмінуць увагай і членаў сваёй сям’і: А.І. Мемус стварыў колькі партрэтаў сына Міхаіла, 2 з якіх (за 1974 г. і 1976 г.) зараз знаходзяцца ў дзяржархіве. Безумоўна, мастак любіў маляваць і сваю студэнтку, а затым і жонку Ірыну Магучую. Некалькі яе партрэтаў, намаляваных на паперы тушшу і алоўкам, цяпер у складзе асабістага фонду А.І. Мемуса. На гэтых творах маладая мастачка звычайна глядзіць удалячынь, нешта засяроджана піша, а ў яе вачах зззяюць думкі пра новыя сюжэты (мал. 5).

У значна меншай ступені ў архіўным фондзе А.І. Мемуса прадстаўлены іншыя жанры выяўленчага мастацтва. Так, у архіў патрапіла 7 арыгіналаў пейзажаў за другую палову 1970-х – пачатак 1980-х гг. Відаць, як чалавека, што нарадзіўся ў сельскай мясцовасці, А.І. Мемуса прываблівалі вясковыя краявіды, таму на яго пейзажах мы бачым драўляныя хаткі сярод дрэў, каня, запрэжанага ў воз з сенам, казу, якая скубе траву ў садзе [9, арк. 3]. Нацюрмортаў налічваецца ўсяго толькі 3: за 1982, 1996–1997 гг. Першы з іх намаляваны шарыкавай ручкай, другі – фламастарам у спалучэнні з акварэллю, трэці – алоўкам (мал. 6). Спрабаваў сябе мастак і ў інтэр’ерах: у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваюцца замалёўкі “Інтэрнатаўскі сюжэт”, “Мішын куток” (абодва створаны ў 1976 г.) – адлюстраванне на паперы побыту мастака, які пэўны час жыў у інтэрнаце.

Шмат з якіх сваіх карцін А.І. Мемус зрабіў копіі: у выглядзе фотаздымкаў, ксеракопій, раздрукаваў каляровымі паштоўкамі. Акрамя таго, пэўныя карціны былі надрукаваны ў часопісах і газетах – мастак збіраў гэтыя публікацыі і папоўніў імі свой асабісты фонд. У выніку

ў абласным архіве захоўваюцца копіі 56 партрэтаў розных асоб, створаных у 1960–2017 гг., 27 аўтапартрэтаў 1961–2016 гг., 83 партрэтаў І. Магучай 1983–2001 гг. (уражвае колькасць твораў, створаная менш чым за 20 гадоў), 77 нацюрмортаў 1970–2010 гг., 55 пейзажаў 1969–2004 гг., 4 калажаў і плакатаў 1980–1990-х гг. (мал. 7–9). Нават калі ўлічыць, што былі зроблены копіі не ўсіх карцін, можна ўбачыць, наколькі плённай была праца мастака: штогод у яго майстэрні з'яўлялася па некалькі рознажанравых твораў. На адваротах амаль усіх гэтых рэпрадукцый А.І. Мемус пазначыў назву твора, год яго стварэння, тэхніку выканання, што дае досыць поўнае ўяўленне пра карціну. На жаль, пэўная частка копій зроблена ў чорна-белым варыянце, таму для атрымання эстэтычнай асалоды неабходна звяртацца да арыгінала. На некаторых партрэтах маюцца адзнакі, якая канкрэтна асоба адлюстравана, зрэдку трапляюцца нават кароткія звесткі пра таго ці іншага чалавека, кшталту "Ліза была прадаўшчыцай магазіна кнігі на пл. Перамогі (жыве цяпер недзе ў Пскове)" [14, арк. 9]. Акрамя таго, зрэдку ёсць запісы, каму прададзены альбо падараваны той ці іншы твор, і ў якіх зборах ён знаходзіцца.

Некаторыя рэпрадукцыі – зусім эксклюзіўныя, бо на іх зафіксаваны творы, якія не захаваліся да сённяшняга дня, і таму яны з'яўляюцца адзінымі крыніцамі, на падставе якіх можна меркаваць пра існаванне гэтых карцін. У прыватнасці, "Нацюрморт з букетам бэзу" [12, арк. 27] і "Аўта ў выглядзе Лесуна" (мал. 10) былі самім жа А.І. Мемусам "па фатаграфаванні знішчаны".

Нямала рэпрадукцый і ў каталогах выстаў, альбомах творчасці мастака. Напрыклад, у 1989 г. у галерэі гарадскога цэнтра культуры г. Віцебска прайшла выстава "Сто малюнкаў Аляксандра Мемуса". У адпаведным каталозе прыведзены спіс гэтых карцін, а таксама змешчаны рэпрадукцыі 21 з іх. Як адзначыла ва ўступным артыкуле да гэтага каталога мастацтвазнаўца В. Пагарэлава, "працы А. Мемуса заўсёды пазнавальныя дзякуючы асаблівай эмацыянальнасці. Ён выдатны рысавальшчык з тонкім разуменнем культуры лініі і колеру, якая неад'емная ад яго ўнутранага свету" [16, арк. 2].

Знаходзяцца ў архіўных фондах і каталогі выстаў у Рэспубліканскім Доме мастацтваў Саюза тэатральных дзеячаў БССР (адбылася ў 1990 г., тут было прадстаўлена 56 карцін А.І. Мемуса), Віцебскім абласным навукова-метадычным цэнтры народнай творчасці (праходзіла таксама ў 1990 г., на ёй было выстаўлена 40 акварэляў).

Адчуць творчую атмасферу заўзятага мастака і краязнаўцы дапамагае выдадзены ім самім у 2011 г. альбом "Каўчэг". У ім сабрана каля пяці дзясяткаў фота з адлюстраваннем майстэрні, якой А.І. Мемус карыстаўся на працягу 1982–2010 гг. Наколькі важным для творцы быў гэты асяродак натхнення, што размясціўся ў вонкава непрыкметным драўляным дамку па вул. Шрадэра, сведчаць разважанні А.І. Мемуса: "Гадамі наседжанае гняздо пакінуць няпроста. Калі ж гэта майстэрня мастака, – здаецца амаль "катастрафічна". Гняздо ж, на стварэнне якога аддадзена было столькі сіл, нерваў, часам адчаю, робіцца з гадамі наканаванай мадэллю жыцця, адзіна суджанай, што ператварылася, здаецца, у шкілет твайго цела, звінчаны, скручаны непарушна – трывала, да канца..." [17, арк. 2 адв.]. "Каўчэг" А.І. Мемуса можна з упэўненасцю назваць сапраўднай мастацкай галерэяй, музеем старажытнасцей. Усе сцены тут былі заняты карцінамі – завершанымі і над якімі творца яшчэ працаваў, прадметамі побыту, знойдзенымі ім у старажытных беларускіх гарадах, паліцамі з кнігамі [17, арк. 6]. Памяшканні асвятляліся вялікай настольнай лямпай з прыглушаным чырвоным святлом, якое надавала майстэрні дадатковую таямнічасць (мал. 11).

У 2012 г. А.І. Мемус выдаў альбом "Акварэля", дзе прапанаваў аматарам мастацтва 48 сваіх твораў – нацюрмортаў і партрэтаў. У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваецца і яшчэ адзін альбом, што пабачыў свет у тым жа годзе. А.І. Мемус прысвяціў яго Ірыне Магучай і даў сімвалічную назву – "Двое". Не менш сімвалічнай з'яўляецца і колькасць карцін, уключаных мастаком у гэтую серыю – 22 выявы, зробленыя алеем. На кожнай з іх – старадаўнія шкляныя кілішкі, падобныя да тых, што мастак паназбіраў на берагах Заходняй Дзвіны. Яны знявечаныя, але заўсёды разам, і абавязковым атрыбутам кожнай карціны з'яўляецца кветка ці якаясьці мудрагелістая расліна як увасабленне кахання паміж мужчынам і жанчынай.

Другую – таксама шматлікую – групу дакументаў у асабістым фондзе А.І. Мемуса складаюць **фотаздымкі** (з іх сфарміравана 119 архіўных спраў). Паводле тэматыкі выяў яны дастаткова разнастайныя, і ў прыватнасці, пра зацікаўленасць мастака архітэктурай і краязнаўствам сведчаць фатаграфіі помнікаў гісторыі і культуры, зробленыя ім не толькі ў Беларусі, але яшчэ і ў Расіі, Латвіі, Літве. Гэтыя фатаграфіі сталі вынікам вандровак па гарадах і вёсках у 1970–1990-я гг., у свой час А.І. Мемус раздрукаваў звыш 300 гэтых фотаздымкаў і прадаставіў іх у Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. На самай жа справе здымкаў было

зроблена нашмат больш: у краязнаўцы захаваліся негатывы – плёнкі, лік якіх перавышае сотню (і на кожнай з іх – каля трох дзясяткаў кадраў). У бліжэйшыя гады плануецца раздрукаваць пэўную частку гэтых здымкаў і дапоўніць імі фонд А.І. Мемуса.

Усе фотаздымкі аб'яднаны імкненнем зафіксаваць помнікі архітэктуры з рознай адлегласці (сярод іншай забудовы і асобна), з самых розных ракурсаў. Фатаграфаваў А.І. Мемус і найбольш адметныя на яго думку элементы: дзверы з каванымі петлямі, разныя драўляныя ліштвы на вокнах, вітыя кранштэйны для навесаў над уваходамі і да т.п. Пры магчымасці краязнаўца фатаграфаваў унутраны выгляд помнікаў архітэктуры, многія з якіх у той час былі занядбанымі і ніяк не выкарыстоўваліся. Заўважым, што 1970–1980-я гг. з'яўляліся часам абуджэння цікавасці да гістарычнай спадчыны, часам разгортвання рэстаўрацыйных работ, і ў сувязі з чым фотаздымкі А.І. Мемуса набываюць яшчэ большую каштоўнасць, бо адлюстроўваюць вонкавы выгляд збудаванняў і іх інтэр'ераў у стане, у якім яны існавалі да рэстаўрацыі ці ў працэсе гэтай працы. Дарэчы, краязнаўцу прываблівалі не толькі мураваныя помнікі, але і драўляная забудова розных населеных пунктаў – жылыя дамы, якія ў той час стаялі нават у цэнтрах гарадоў. Натуральна, сёння, калі ўжо мінула 40–50 гадоў, многія з гэтых самабытных збудаванняў, прыкладаў народнай культуры, знішчаны ўрбанізацыйнымі працэсамі.

А.І. Мемус пабываў асабіста ва ўсіх 6-ці абласцях Беларусі, але найбольшую колькасць здымкаў зрабіў на Віцебшчыне. Непасрэдна ў г. Віцебску ім былі зафатаграфаваны будынкі ратушы, Дабравешчанскай і Пакроўскай цэркваў, касцёла Святой Варвары, базыльянскага кляштара, Аляксандраўскай мужчынскай гімназіі, забудовы плошчы Свабоды, вуліц Савецкай, Грыбаедава, Талстога, а таксама месца існавання Васкрасенскай (Рынкавай) царквы.

Датычна іншых адметных мясцін Віцебскай вобласці ў фондзе ўтрымліваюцца фотаздымкі яшчэ па 12 населеных пунктах. Так, у г. Полацку краязнаўца пабываў каля Сафійскага сабора, Богаяўленскай царквы, храмаў Спаса-Ефрасіньеўскага манастыра, лютэранскай кірхі, доміка Пятра І, у г. Паставы ён зрабіў здымкі касцёла Святога Антонія Падуанскага, у в. Барань Аршанскага раёна – Спаса-Праабражэнскай царквы, у г. Гарадку – станцыйнага дома, у г.п. Ушачы – касцёла Святога Лаўрэнція. Апошні ў час наведвання яго А.І. Мемусам знаходзіўся ў паўразбураным стане: без даху, адсутнічала шкло ў вокнах і вітражах (мал. 12). Храм быў адрэстаўрыраваны толькі ў пачатку 2000-х гг., таму фотаздымкі могуць яскрава распавесці пра яго гісторыю. Акрамя таго, фотасправаздачы А.І. Мемус прывёз і з в. Смальяны Аршанскага раёна [19, арк. 2], г. Оршы, в. Лужасна Віцебскага раёна, г.п. Відзы і г.п. Друі Браслаўскага раёна (мал. 13–14), г. Глыбокае, г. Дзісны Міёрскага раёна.

Падарожнічаючы па астатніх абласцях, мастак не мог не пабываць у такіх знакавых для Беларусі гарадах, як Гродна, Мінск, Мсціслаў, Нясвіж, Навагрудак [21, арк. 12]. У яго асабістым фондзе ёсць выявы замка і капліцы-пахавальні Святаполк-Мірскіх у г.п. Мір Карэліцкага раёна, касцёла Святога Андрэя апостала ў г. Слоніме Гродзенскай вобласці [22, арк. 4], руін замка Сапегаў у г.п. Ружаны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці [23, арк. 5] і многія іншыя. А.І. Мемус любіў фатаграфаваць помнікі архітэктуры ў атачэнні аўтамабіляў і людзей, якія спяшаліся кудысьці па сваіх справах, драўляныя жылыя хаты, якія ствaралі яўны кантраст на фоне векавых муроў. На здымках мастака – выявы без упрыгажэння, нярэдка – вокны без шкла, нібыта пустыя вачніцы, папсаваная тынкоўка, нібыта адзенне, якое ад часу пераўтварылася ў рыззё (мал. 15–16).

У час паездак у Расію А.І. Мемуса зацікавілі архітэктурныя каштоўнасці Ленінграда, Масквы, Петрапаўлаўска-Камчацкага, Пецяргофа, Уладзівастока, Уладзіміра [26, арк. 4], Яраслаўля, з літоўскіх гарадоў – Вільнюс [27, арк. 6], з латвійскіх – Рыга.

Акрамя зацікаўленасці архітэктурай А.І. Мемус быў заўзятым збіральнікам старадаўніх прадметаў побыту, якія вымывала сваім цячэннем Заходняя Дзвіна ці якія выяўляліся на месцах будаўнічых работ пасярод гарадоў. Найбольш плённымі былі пошукі краязнаўцы ў Віцебску і Полацку. За некалькі дзесяцігоддзяў ён назбіраў вялікую калекцыю самых розных вырабаў: кафлю XVII – пачатку XX ст., нацельныя крыжыкі, пярсцёнкі, амулеты, упрыгажэнні, рыбалоўныя прылады, замкі, ключы, крэсівы, нажы і іншыя металічныя вырабы XII – пачатку XX ст., фрагменты керамічнага і шклянога посуду XVII – пачатку XX ст. [30, арк. 5], керамічныя курыльныя люлькі, свістулькі XVII–XVIII стагоддзяў, драўляныя дэкаратыўныя элементы з жылых дамоў пачатку XX ст. і нават старажытнарымскія ды сярэднявечныя манеты. Свае знаходкі А.І. Мемус таксама зафатаграфаваў, і гэтыя фотаздымкі зараз захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці (мал. 17–18).

А.І. Мемус адчуваў сябе мастаком не толькі з фарбамі, але і з фотаапаратам, прамое сведчанне гэтага – вялікая колькасць

фотапейзажаў, фотапартрэтаў і фотанацюрмортаў, створаная ім. У прыватнасці, у яго асабісты фонд патрапіла 105 фотапейзажаў за канец 1950-х – пачатак 1990-х гг. Яны зроблены і ў тых мясцінах, дзе даводзілася жыць мастаку, і ў час яго падарожжаў (мал. 19). Улюбёнай гераіняй фотапартрэтаў яго аўтарства, несумненна, з'яўлялася Ірына Магучая. Мастак фатаграфаваў сваю каханую ў творчай майстэрні па вул. Шрадэра ў г. Віцебску, на фоне архітэктурных збудаванняў, на берагах рэк [32, арк. 5; 33, арк. 11]. У абласным архіве ў цяперашні час налічваецца звыш 150 такіх здымкаў, зробленых у 1980-я – пачатку 2000-х гг. (мал. 20). Акрамя таго, А.І. Мемус засведчыў на фота нямала сваякоў, сяброў, знаёмых і нават эксперыментаваў з фотааўтапартрэтамі (мал. 21).

Асобную групу дакументаў складаюць **рукапісы** А.І. Мемуса: мастацкія апавяданні, вершы, артыкулы, інтэрв'ю. Што да апавяданняў, то аўтар падпісваў іх псеўданімам "Алесь Пруск" – з прозвішчам, утвораным ад назвы роднай вёскі. Пераважная большасць іх напісана ўласнай рукой А.І. Мемуса ў перыяд з 1983 г. па 2005 г., частка – надрукавана з дапамогай камп'ютара. Свае апавяданні мастак аб'ядноўваў у цыклы, у прыватнасці, у "Выбраныя сны" патрапілі "Сон першы", "Сон з сустрэчным у львіных скурах", "Сон з капялюшам", "Фрагменты сну з маніяй вялікасці"... Даты, прастаўленыя ў канцы кожнага з рукапісаў, сведчаць пра тое, што натхнілі на апавяданні сны – ноч з 29 на 30 красавіка 1997 г., ноч з 18 на 19 кастрычніка 2003 г. [36, арк. 1–5]. Яшчэ адзін цыкл – "Абразкі" – увабраў у сябе кароткія зацемкі: успаміны з дзяцінства, убачанае з балкона кватэры ды і ўвогуле жыццёвыя назіранні.

Вершы А.І. Мемуса, якія патрапілі ў дзяржаўны архіў, нешматлікія – усяго два творы: "Свеча", напісаны 15 лютага 1984 г., і "Вільні" (22–23 кастрычніка 1992 г.).

Апантаны краязнаўца, А.І. Мемус падрыхтаваў шэраг артыкулаў па пытаннях археалогіі, захавання гісторыка-культурнай спадчыны ("Вечар у Шклове", "Уздоўж берага ў гісторыю (альбо патрэба агню)", "Яшчэ раз аб Віцебскім мастацкім музеі" і інш.). У 1980-я – пачатку 2000-х гг. іх ахвотна друкавалі такія газеты, як "Чырвоная змена", "Голас радзімы". Наяўнасць у фондах архіва рукапісаў, варыянтаў твораў, а таксама асобнікаў перыядычных выданняў з апублікаванымі творамі дае выдатную магчымасць прасачыць творчы працэс ад пачатку да канца. У той жа перыяд А.І. Мемус падрыхтаваў нямала матэрыялаў пра беларускіх мастакоў – сваіх калег па творчасці і тых, хто пісаў карціны ў першай палове XX ст. – Я. Драздовіча, А. Елізарава, В. Ляховіч, Л. Мядзвецкага, Ф. Рушчыца, Р. Спачыньскую, П. Явіча. Вялікую колькасць артыкулаў – больш за 30 – у 1997–2013 гг. мастак прысвяціў Ірыне Магучай. Пра яе жыццё і творчасць ён распавёў у артыкулах, самі назвы якіх прасякнуты моцнымі пачуццямі ("Шэсьце з анёлам", "Асоба, якая руйнуе межы") [37, арк. 1–35].

Пра сваю біяграфію, жыццёвыя правілы, погляды на захаванне матэрыяльнай і духоўнай культурнай спадчыны А.І. Мемус расказаў у інтэрв'ю, 3 з якіх знаходзяцца на захаванні ў архіве. Яны былі падрыхтаваны ў 1990, 2000, 2002 гг. і апублікаваны ў беларускіх рэспубліканскіх і мясцовых газетах. У адным з гэтых інтэрв'ю мастак, падсумоўваючы ўсе папярэднія апаведы і як бы канцэнтруючы ў адной фразе свае погляды на існаванне, зазначыў: "Беларусь?.. На маім акварэльным аркушы «Белая жаробка», створаным у 1995 годзе, яна з перабітымі ножкамі... Перад ёю завялыя кветкі... за ёю стаптаная гісторыя... Але жаробка скача!" [38, арк. 4].

Разам з пералічанымі вышэй дакументамі А.І. Мемус здаў у Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці сваю **перапіску.** Значную долю яе складаюць пісьмы мастакоў, гісторыкаў, грамадскіх дзеячаў не толькі Беларусі, але і замежжа. Усяго ў асабістым фондзе сабраліся лісты ад 37 такіх адрасатаў. Напрыклад, пра арганізацыю выстаў А.І. Мемус у 1989 г. перапісваўся з беларускім мастаком, літаратарам Алегам Аблажэем, у 2001 г. і 2010 г. – з супрацоўніцай Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў Жанай Курдо (Крукач). У 1996, 1997, 1999 гг. Ала Паўлава запрашала віцебскага мастака прадставіць свае карціны для яе ўласнай мастацкай галерэі ў г. Дордрэхце (Галандыя). Падрыхтоўку публікацый А.І. Мемус абмяркоўваў з беларускімі гісторыкамі Міхаілам Белямуком, Мікалаем Ермаловічам, Міхаілам Ткачовым, стварэнне музейных экспазіцый – з археолагам, спецыялістам па сярэднявечнай гісторыі г. Віцебска Леанідам Калядзінскім.

Праз перапіску А.І. Мемус падтрымліваў сувязі і са сваякамі. На захаванне ў абласны архіў ён перадаў 10 лістоў ад бацькоў (дакументы датаваны 1988–1992 гг.). Пасля ад'езду І. Магучай у Еўропу яна дасылала ў г. Віцебск паштоўкі, фотаздымкі, лісты, у якіх апісвала свае ўражанні ад новага жыцця, мастацкія поспехі, падарожжы па розных краінах. Усяго А.І. Мемус перадаў у архіў 28 лістоў сваёй каханай за 2003–2010 гг.

Апроч усяго, творчая дзейнасць вымагала ад А.І. Мемуса актыўнай перапіскі з разнастайнымі ўстановамі і арганізацыямі, якую ён вёў на працягу 1983–2013 гг. Пра зацікаўленасць яго шматграннай творчасцю сведчаць лісты з рэдакцый

газет “Літаратура і мастацтва”, “Голас Радзімы”, “Савецкая культура”, “Сцяг камунізму”, “Ніва”, “Чырвоная змена”, выдавецтва “Беларуская савецкая энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі. У пачатку 2000-х гг. беларускага мастака актыўна запрашалі на пленэры яго замежныя калегі з Радомскага акруговага аддзялення Саюза польскіх мастакоў, аргкамітэтаў Міжнароднага мастацкага пленэра ў г. Ружаныстоку і міжнароднага пленэра жывапісу “Лета ў Баўсцы”.

Асобную групу ў вопісе асабістага фонду А.І. Мемуса складаюць матэрыялы, якія паводле архіўнай традыцыі называюцца “**дакументы да біяграфіі**”. Так, асноўныя этапы працоўнай дзейнасці зафіксаваны ў асабовай справе, якая яшчэ ў 2013 г. была перададзена з архіва Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава ў Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, калі пачыналася праца па зборы дакументаў для стварэння фонду А.І. Мемуса. Склад гэтай справы – традыцыйны: асабовы лісток па ўліку кадраў [39, арк. 7], копіі дыпломаў і пасведчанняў, выпіскі з загадаў.

Пра творчую дзейнасць распавядаюць буклеты выстаў, у якіх А.І. Мемус браў удзел разам з іншымі мастакамі. Напрыклад, для экспазіцыі ў памяшканнях Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава ў 1987 г. А.І. Мемус прадаставіў свой твор “Рыбалка”, а на выставу, прысвечаную Ул. Караткевічу, у лістападзе 2000 г. – трыпціх “Наш Караткевіч”, завершаны ў тым жа годзе.

Дапаўняюць гэты спіс акты прыёму карцін беларускімі музеямі ў 1986, 1992, 2002, 2011–2012 гг. – як для папаўнення фондаў, так і для правядзення экспазіцый. Сярод іх – Дзяржаўны мастацкі музей БССР, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Музей Марка Шагала ў Віцебску, Полацкі гісторыка-археалагічны запаведнік, музейны комплекс “Гісторыя і культура Аршаншчыны”, Мастацка-вытворчае таварыства “Рыса”. Дзеля такіх выстаў былі падрыхтаваны адмысловыя запрашэнні (мал. 22). Адметна, што запрашэнні на выставу “Сто малюнкаў Аляксандра Мемуса” былі выкананы ў розных колерах (белым і зялёным), назва выставы аформлена пазнавальным почыркам асабіста мастака, ды і сам ён хітравата касавурыцца з аўтапартрэта на наведвальніка мерапрыемства [40, арк. 1].

Пра асобныя падзеі з жыцця творчага чалавека лаканічным тэкстам распавядаюць і такія дакументы, як пасведчанне пра рэгістрацыю ў якасці кандыдата ў народныя дэпутаты Віцебскага гарадскога Савета народных дэпутатаў (1990 г.), анкета дэлегата VII абласной канферэнцыі Беларускага дабраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1991 г.), удзячнасці за ўдзел у міжнародных мастацка-латаратурных пленэрах у г. Ружаныстоку (2001–2002, 2004–2005 гг.).

Шэраг архіўных спраў аб’яднаны ў групу “**Дакументы пра А.І. Мемуса**”. Найперш – гэта каля двух дзясяткаў артыкулаў пра выставы і творчасць А.І. Мемуса, апублікаваных у беларускіх і польскіх газетах, часопісах, электронных рэсурсах у 1987–2012 гг. Аўтарамі былі М. Паграноўскі – галоўны захавальнік Дзяржаўнага мастацкага музея Беларусі, М. Цыбульскі – мастацтвазнаўца і таварыш А.І. Мемуса, журналісты Я. Ільіна, Я. Шыдлоўская і інш.

Па-другое, побач са згаданымі артыкуламі захоўваюцца 3 кнігі водгукаў на творы А.І. Мемуса, самы ранні запіс у якіх – 7 сакавіка 1990 г., найбольш позні – 2 чэрвеня 2012 г. Рознымі почыркамі, кірыліцай і лацінкай пакінулі свае ўражанні на паперы студэнты, настаўнікі, харэографы, школьнікі… Сярод іншых чытаем тут такія надпісы: “Дзякую за пачуццё прагі жыць пасля фарбаў, ценяў і святла, што праплываюць перад вачыма”, “Праз які боль і пакуты, жорсткасць і разбурэнні прайшла душа гэтага Мастака-Чалавека?! Як дапамагчы і даць жыватворную вільгаць, каб душа заззяла на халсце?” [41, арк. 11, 19].

Вялікая група ў архіўным фондзе А.І. Мемуса – **выяўленчыя дакументы** (у адрозненне ад згаданых вышэй гэтыя створаны іншымі мастакамі і фатографамі). Адзін з двух маляваных партрэтаў, якія патрапілі сюды, гэта шарж, выкананы П. Анашчанкам у чэрвені 1983 г. І хоць аўтар прысвяціў яго “найшаноўнай паненцы Таццяне з выпадку абароны дыплома”, яна аддала твор любімаму выкладчыку [42, арк. 1]. Другі партрэт створаны аматарам акварэлі Ф. Гуменам прыкладна ў пачатку 1980-х гг.

Сярод фотаматэрыялаў налічваецца звыш 100 індывідуальных здымкаў А.І. Мемуса (ад 1950 г. да 2015 г.) [43, арк. 9; 44, арк. 5], іншымі словамі, ад школьнага да сталага ўзросту) (мал. 23). Разам з імі – фатаграфіі сваякоў: дзеда Іосіфа Іосіфавіча, бацькі Іосіфа Іосіфавіча (дарэчы, мастак меў шанец таксама стаць Іосіфам, але ў самы апошні момант яго назвалі Аляксандрам), маці Лізаветы Платонаўны, сястры Ганны, жонкі Галіны. Пералічаныя фотаздымкі датуюцца 1932 г., 1950–1960-мі гг., амаль усе яны прадстаўлены арыгіналамі, ёсць толькі адна фотакопія з дакумента 1910-х гг.

На групавых фотаздымках зафіксаваны асноўныя жыццёвыя этапы А.І. Мемуса: вось ён з іншымі вучнямі 10-га класа Елізаўскай школы, затым – з навучэнцамі Уладзівастоцкага мас-

тацкага вучылішча, з саслужыўцамі. На шматлікіх фота – з удзельнікамі пленэраў і студэнтамі, такімі ж апантанымі, як і А.І. Мемус (мал. 24), з сябрамі клуба "Узгор'е", якія расчышчаюць сутарэнні віцебскай Пакроўскай царквы, з наведвальнікамі выстаў, вочы якіх ззяюць ад захаплення творчасцю А.І. Мемуса. Тут жа сабраны фатаграфіі выстаў яго карцін у г. Віцебску, г. Дордрэхце ў Галандыі, г. Ружаныстоку ў Польшчы, інтэр'ераў майстэрні і кватэры А.І. Мемуса.

Мастак захапляўся збіраннем не толькі прадметаў археалогіі, але і **паштовых картак**, якія затым ён таксама прадаставіў у Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. У калекцыі А.І. Мемуса налічвалася каля дзясятка паштовых картак з выявамі рэпрадукцый карцін, 20 картак з выявамі населеных пунктаў Расійскай імперыі за 1910-я гг., некалькі экзэмпляраў, прысвечаных гарадам Расіі ў міжваенны час, каля 50 паштовак з выявамі населеных пунктаў Еўропы, ЗША, Азіі, выдадзеных у 1910–1930-я гг. Паштоўкі, надрукаваныя ў пазнейшы час – 1950-я – пачатку 2000-х гг. – цікавілі краязнаўцу ў меншай ступені, пра што сведчыць іх невялікая колькасць у архіўным фондзе. Асаблівае стаўленне ў А.І. Мемуса было да г. Віцебска, што заканамерна: па вуліцах гэтага горада мастак меў магчымасць шпацыраваць і сузіраць яго архітэктуру ледзьве не штодня. Адпаведна, і ў калекцыі выявы губернскага, а затым і абласнога цэнтра займаюць пачэснае месца (звыш 70 асобнікаў). Яны прадстаўлены фотакопіямі паштовых картак і фатаграфій канца XVIII – пачатку XX ст., здымкаў 1920–1930-х гг., а таксама арыгіналамі пасляваенных фотаздымкаў.

Дадаткам да архіўнага фонду мастака сталі **дакументы яго сына Міхаіла**, які нарадзіўся ў 1971 г. і трагічна загінуў у 1988 г. Вялікая колькасць малюнкаў – амаль паўтары сотні – гэта казачныя сюжэты, жывёлы, аўтамабілі, ваенная тэхніка, партрэты. Сюжэтныя малюнкі прасякнуты дынамікай, імклівасцю, нібыта самалёт ці матацыкл зараз сарвецца з аркуша, праляціць побач і знікне ўдалечыні. Малады мастак аддаваў перавагу каляровым алоўкам, радзей выкарыстоўваў фламастары, шарыкавую ручку ці пастэль. А.І. Мемус клапатліва сабраў нават самыя раннія малюнкі сына, зробленыя ў 1974 г.

Акрамя сваіх дакументаў А.І. Мемус здаў у архіў дакументы сваёй жонкі – Ірыны Віктараўны Магучай – мастачкі, творчасць якой вядома і ў яе родным Віцебску, і ў Заходняй Еўропе, і ў Ізраілі. Дакументы знакамітай мастачкі складаюць асобны вопіс – на 161 архіўную справу. А.І. Мемуса і І.В. Магучую звязвала моцнае каханне, якое можна наглядаць у шчаслівых тварах на фотаздымках і ў тым, як пачынаюць ззяць вочы мастака, калі ён згадвае сваю жонку. Ён ласкава называў яе Ішай, яна яго – Шушам, замілаванасцю адно адным прасякнуты тэксты на паштоўках, якія Ірына дасылала А.І. Мемусу з еўрапейскіх пленэраў. І.В. Магучая памерла ў 2010 г., але ў архіўным фондзе двое закаханых мастакоў назаўсёды разам.

**Заключэнне.** Кароткі агляд дакументаў А.І. Мемуса толькі ў невялікай ступені раскрывае ўсю рознабаковасць сабранага ім архіўнага фонду, які ўтрымлівае каштоўныя крыніцы і па выяўленчым мастацтве другой паловы XX – пачатку XXI ст., і па гісторыі беларускай архітэктуры. Дакументы А.І. Мемуса – жывыя сведчанні грамадска-палітычных і культурных падзей г. Віцебска, погляд знутры, погляд непасрэднага ўдзельніка. Атрымаць асалоду ад працы са згаданымі матэрыяламі можа любы наведвальнік чытальнай залы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 2.
2. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 4.
3. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 6.
4. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 15.
5. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 16.
6. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 19.
7. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 25.
8. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 30.
9. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 35.
10. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 38.
11. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 48.
12. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 62.
13. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 66.
14. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 47.
15. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 54.
16. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 76.
17. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 79.
18. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 98.
19. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 99.
20. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 103.
21. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 107.
22. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 115.
23. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 119.
24. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 110.
25. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 118.
26. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 132.
27. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 130.
28. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 136.
29. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 137.
30. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 138.
31. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 151.
32. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 174.
33. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 157.
34. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 156.
35. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 199.
36. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 202.
37. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 220.
38. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 232.
39. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 306.
40. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 310.
41. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 321.
42. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 329.
43. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 331.
44. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 332.
45. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 333.
46. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 1. Спр. 350.


*Паступіў у рэдакцыю 11.06.2024*